**Аксана Данільчык**

# IL MEZZOGIORNO

## ПОЎДЗЕНЬ

Вершы

Мінск
«Кнігазбор»
2006

УДК 821.161.3-1
ББК 84(4 Беи)
Д18 60

На вокладцы — малюнак
Стэфана Леу

Нарадзілася ў Мінску (1970). Аўтар паэтычнага зборніка «Абрыс Скарпіёна» (1996) і кнігі вершаў для дзяцей «Павуцінка на агрэсце» (2005). Перакладае з італьянскай мовы, займаецца дасследаваннем італьянскай літаратуры.

ISBN 985-6824-39-7

© Данільчык А., 2006
© Афармленне, ПУП «Кнігазбор», 2006

*Die Sehnsucht,*
*die jetzt dein genzes Wesen wohltätig erwärmt,*
*wird in hundert Strahlen zerspaltet,*
*dich quälen und martern,*
*denn der Sinn wird die Sinne gebären,*
*und die höchste Wonne,*
*die der Funke entzündet, den ich in dich hineinwerfe,*
*ist der hoffnungslose Schmerz, in dem du untergehst,*
*um aufs neue fremdartigemporzukeimen. -*
*Dieser Funke ist der Gedanke!*

E.T.A. Hoffmann, Der goldne Topf

# АВАЛОДВАННЕ

* * *

І я пайшла. Аголеныя нервы сціскаліся
ад дотыку вятроў,
Якія сонца падымалі з небакраю.
Перадсмяротны крык лясных звяроў
Застыў на снезе россыпам караляў.

Збянтэжаны гармоніяй аргана віхурны баль
міжволі адступіў,
Каб потым знікнуць назаўжды
ў святле бліскучым.
Растурбаваны час лязом тупым
Закладнікаў сваіх ужо не мучыў.

У роздуме маўклівага світання воск зацвярдзеў.
Вядзецца так здаўна.
І вугаль контур сцен накрэсліваў няпэўна.
Так пачынаўся год. І з нечага акна
Падаў свой голас пераможца певень.

* * *

Абяцанне высокага неба,
абяцанне далёкага краю —
Тут твой крыж і твой шлях.
Разам з часам і я згараю
На няспынных зямных вятрах.

Нехта скажа: «Бывай назаўсёды», нехта скажа:
«Табе шанцуе,
Застаецца толькі прымаць».
Так настойліва лес кіруе,
А куды — адсюль не відаць.

Без сумненняў і слоў развітальных белы ветразь
па хвалях гуляе,
Вось і я сябе адцаю.
Абяцанне высокага неба,
абяцанне далёкага краю,
Каб зямлю зразумець сваю.

* * *

Сонца гарачай далоняй
правяло па бледным твары зямлі,
і зазелянелі яе вочы,
зацвілі яе вусны,
і людзі адчулі яе цёплае дыхание.

А я хачу ў той парк вясновы,
Дзе выпраменьвала вада
У пералівах адмысловых
Такое простае «аддай».
А там, у глыбіні бяздоннай,
Хаваўся першы знак спякоты,
І колер матылёў лімонны —
Як пацалункаў першых дотык.
Там, у спакоі непарушным,
Кранаў стамлёны вецер космы,
Там юная студэнтка Ксюша
Паліла нетаропка «Космас»...

**Прадказанне**

На зледзянелую дарогу
Снягір выплёўваў арабіну,
Ліхтар глядзеў з перасцярогай,
Як белы двор у смецці гінуў.
А за фіранкаю чырвонай,
Гульнёй павелічальных шкельцаў,
Сустрэўся позірк падазроны
З ласкавым вокам у бутэльцы.
У цьмяным дыме тытунёвым
Знікаў адбітак прабачэння,
І абяцаў кароль бубновы
Магчымасць новага натхнення.
У дзень святога Валянціна,
Паслаўшы ўсіх сваіх каханкаў,
Нерамантычная жанчына
Павольна напаўняла шклянку.

* * *

Спыніўся за зялёнай драпіроўкай
Асірацелы прывід перамогі
І выклаў на стале з ільдзінак тонкіх
Бязлітасна: «Не будзе дапамогі».
Ад смутку задрыжалі габелены,
Варушачы малюнкі дрэў і лісця,
І пацяклі струменьчыкі па сценах —
Бяссільны дождж, затоеная прыкрасць.
І енчыў бедны звер, у кут загнаны,
Ад чалавека і багоў залежны,
І надмагільным помнікам з туману
Павольна выплывала непазбежнасць.

* * *

Уздыхні з палёгкаю
І хадой таропкаю
Выйдзі з-за дзвярэй.
Усё, што трэба, сказана,
І вузлы развязаны,
Каралю і блазну
Можна жыць далей.

На шырокай вуліцы
Ноч да вокнаў туліцца —
Вечны час маны.
Сцеражыся гномікаў,
Іх маленькіх домікаў,
Са старэнькіх томікаў
Выбегуць яны.

Думкі іх нязначныя,
Постаці нябачныя —
Нам не зразумець.
Захаплёны казкаю,
Цёплых словаў ласкаю,
Пад чырвонай маскаю
Не заўважыш смерць.

* * *

Пяшчотна-ружовым колерам неба — за далягляд.
Гэта — час медытацый.
Вазьміце мае думкі і не вяртайце назад,
Я пачынаю баяцца.

Стварэнні недасканалыя імкнуцца не закранаць
Раўнавагі ў прыродзе.
Бліскучая імітацыя з вечару да відна
Кімсьці прынятых паводзін.

Існасць тваіх тлумачэнняў — след на бетоннай сцяне
Вільготнага памяшкання.
Там, дзе канец упэўненасці, — слёзы ў віне
І недасяжнасць жаданняў.

Роздум — самы драпежны і самы найгоршы звер.
Пакута маёй істоты.
Пяшчотна-ружовым колерам мара — гэты бар'ер
Пераадолець употай.

* * *

Паўзе задуменна блакітная вадкасць,
То ўперад памкнецца, то рух запаволіць.
Жаданне пісаць — як жаданне паплакаць,
Каб вызваліць цела і памяць ад болю.
Жаданне пісаць — неабходнасць знішчэння,
Таго, што мацней за звычайныя з'явы,
Душу раздрабніць на адзінкі збавення
І ў кожнай — шматлікіх пачуццяў праявы.
Інстынктаў гульня — ў харастве інтанацый,
Гармоніі фарбаў, багацці мелодый.
Паплакаць, стварыць, а пасля развітацца,
Каб зноў уяўляць, спасцігаць і знаходзіць.

* * *

Жыццё без фіранак. З бурштынавай плыні
Цябе забірае ўльтрамарын
І цягне ў бясконцасць, і гукі застынуць
У формах нябачаных там на спачын.
Адкрытасць — без грыму і без дэкарацый,
Праходзяць праз шкло ў забаронены свет
Ласкавыя, гнуткія, чуйныя пальцы,
Каб зведаць нарэшце класічны сюжэт.
Блукае ўяўленне ля вобразаў крохкіх,
Фантазій, убачаных некалі ў снах,
Нядоўгім яднаннем прасторы і кропкі
Ствараецца мара аб двух берагах.
Падказаны думкам лагічны напрамак.
Мінорны акорд. І ўвасобяцца ў ім
Усе прывілеі жыцця без фіранак,
Імкненне вялікага зліцца з малым.

* * *

Аднойчы — снег. На снег злятае попел
і растае.
Пасля вада збірае пясок
і шкельцы дробныя былых бутэлек,
яшчэ кавалачкі смалы з асфальту
і круціць іх, і ў рэшце рэшт сплываюць
яны ў рышток, што пад зямлёю ўецца.
Пасля ваду ачысцяць і пальецца
руды спачатку, а пасля даволі чысты
струмень на валасы твае і дела.
І частку кропель прагнае паветра
сабе збірае, і, падхопленыя ветрам,
яны ўздымаюцца ў расхрыстанае неба.
І будзе дождж, і нейкія бярозы,
далёкія ад гарадоў і пылу,
узрадавана замахаюць голлем
і скінуць тыя кроплі разам з лісцем.
Вада вяртаецца на тое ж месца,
адкуль упасці вельмі зручна снегу.

І вось аднойчы — снег...

**Працяг**

Няважна, што без рыфмы верш стварaўся,
што так спяваюць п'яныя казахі,
калі кабыла іх трасе па стэпе,
і што назаўтра Шонія Таццяна
мне скажа (нават з выглядам разумным):
«Аў рэшце рэшт усё такое глупства».
Я згодна, і мы разам паемяёмся.

Але чамусьці хочацца мужчыну.
І не якога-небудзь, а цябе.
Я апрану кароткую спадніцу,
а валасы ў дзве коскі спарадкую.
І пафарбую вусны ў чорны колер.
Тады і я змагу сказаць «jamais»
і шклянку з чорнай кавай перасунуць,
з якой збіраўся нехта каву піць.
Але пра гэта — неяк іншым разам.

**Святлафоры**

Мяне амаль не засталося.
Стаіць закінутым жытло.
І па асфальце расцяклося
Тугі чырвонае святло.
Як папярэджанне з нябёсаў,
Забараняе гэты шлях:
Няварта йсці па снезе босай,
Агонь трымаючы ў руках.

Задумлівыя далягляды
Свой пачынаюць карагод,
І жоўтае святло спагады
Надасць сюжэту новы ход.
Шкада, што доўгае растанне
Паволі спусташае нас,
А страчаныя спадзяванні
Згадаюцца яшчэ не раз.

Народзінамі новай волі
Даніна сплачана даўно.
Зялёнае святло дазволу
Нарэшце разаб'е вакно.
Былой пазбавіцца пакоры
І выйсці да агнёў машын,
І адаб'юцца святлафоры
У шкле патушаных вітрын.

* * *

Асцярожна, крок за кронам,
Нараджаецца спакой.
І святло блакітным вокам
Аглядае мой пакой.
На пакрэмзанай паперы —
Пяць пялёсткаў. Бэзу цень.
У расчыненыя дзверы
Уваходзіць новы дзень.
Астывае цёплы ложак,
Сонца скача па сцяне.
Вецер радасці. А можа,
Ён падхопіць і мяне?
Дакрануцца да фіранак,
Паглядзець на кніжак стос —
І адчуць наступны ранак,
У якім не будзе слёз.

* * *

Ад дабра не шукаюць дабра.
Ад кахання не шукаюць кахання.
Ніхто не шукае нічога.
І тут спыняецца дарога.

Вуаль зялёнага блакіту
Вакол маўклівага камення.
Марскімі травамі спавіта
Туга мінулых пакаленняў.
Празрыстай хваляй дакранецца
Да рук маіх уздых русалкі,
І нечакана зварухнецца
Пачуццяў свет, знаёмы змалку.
З глыбінь, усланых аксамітам,
Марскія зоркі ў неба мкнуцца.
Тўга зялёнага блакіту —
Не абысці, не размінуцца.

* * *

Сонца раскідае промні па каменнях,
абтрасе сланечнік жоўтыя пялёсткі,
мора адшукае свой звычайны колер,
і за хваляй хваля знойдзе шлях у неба;
пойдзе падарожнік у далёкі горад,
каб пасля «бывайце» больш не азірнуцца,
і мінулым стане крок яго няхуткі,
і пяскі схаваюць смерці таямніцы;
загайдаюць дрэвы спозненыя словы,
і даруюць птушкі страчаныя гнёзды,
разаб'ецца сэрца, бы шкляная чарка,
і наступіць нехта, і параніць ногі;
на палі-дарогі лягуць цені ветру,
на вякі заціхне створаная песня,
разгарнецца далеч сцежкаю бясконцай,
і тады, нарэшце, я цябе пакіну.

* * *

І ты не адводзіш вачэй,
і я вачэй не адводжу.
Тканіна, ад шоўку танчэй,
кладзецца на раздарожжа.
Нервова сціскаеш квіток,
глядзяць нерашуча вочы.
Адсюль да мяжы толькі крок,
аб чым запытацца хочаш?
Ідыліяй белых снягоў
мой горад зачараваны,
сляза старажытных багоў
загоіць чыесьці раны.
Холад зімовай пары,
і неба чырвоныя хвалі,
і самалёту абрыс
глытае празрыстая далеч.

* * *

У запыленым горадзе,
Апусцелым ад ліпеньскай спёкі,
Поўзаюць тлустыя мухі
Па жоўтай прасторы бананаў,
І брудны дзядок падбірае
Пустыя бутэлькі з-пад піва.
Да летніх кавярняў прыходзяць
З надзеяй хоць трохі пад'есці
Галодныя бедныя кошкі,
Глядзяць, як глытаюць гарэлку
Падлеткі і алкаголікі.
Цвілую ваду не штурхае
Рака, і здурнелыя качкі
Чакаюць акрайчыка хлеба.
У скверы — адзіная пара.
Ён лашчыць калені і сцёгны,
Яна не варушыцца. Сонца
Сваімі вачамі вампіра
Апошнія сілы забрала
У запыленага і засмечанага горада.

* * *

Блакітныя шпалеры
на сонечнай сцяне.
Я веру — і не веру,
што гэта — пра мяне.
У водблісках заранак
знікае нездарма
той вераснёўскі раиак,
дзе больш мяне няма.
Матывам рытуальным
абрынецца душа,
і так непазнавальна
усмешкі задрыжаць,
і вылеціць на волю
у восеньскі прасдяг
паперка з новай роляй,
наіўнай, як дзіця.
Блакітныя шпалеры
на сонечнай сцяне
я веру — і не веру,
што гэта — пра мяне.

* * *

Вярніце мне маю душу.
Я — толькі думкі рух злачынны.
Я не жыву і не пішу,
Я — толькі сон бесперапынны.

Я — абсалютны недавер
І асалода пранікнення,
Калісьці, заутра і цяпер,
Злучоныя адным імгненнем.

І не спяшаюцца суняць
Анёлы зменлівае цела.
Прыйдзі, душа мая, спазнаць,
Што робіцца са мной, спусцелай.

Яшчэ надзею грашу,
Яшчэ крычу ў прасторы звонкай:
«Вярніце мне маю душу,
Ці забярыце абалонку».

## Імправізацыя на зададзеную тэму

*Дальше ехать некуда. Дальше не*
*отличить златоустца от златоротца.*
*И будильник так тикает в тишине,*
*точно дом через десять минут взорвётся.*
И. Бродский

Рухаецца паветра
І разрывае ветразь.
Зялёнае робіцца жоўтым, каб потым стаць проста веццем.
А за пахіленым плотам
Скурчыцца адзінота —
Блёсткі шукаць у смецці.

Холад пустой кватэры,
Вока скажае памеры,
Ад перакуленай столі адштурхнулася лодка.
Верасень, як пачатак,
Пошук — няўдзячны занятак,
Калі яго не ацэніць знаходка.

Секс для адных паратунак,
А для другіх пачастунак.
Ні першыя, ні другія не зведалі сэнсу.
Секс не можа быць мэтай.
Толькі спасцігнуўшы гэта,
Можна знайсці кансэнсус.

Радасць усіх натхненняў —
Шчырасць неразумення
Еднасці колеру неба з фарбай зямной палітры.
На скрыжаваннях дарогі
Людзі калечаць ногі,
Рукі, галовы, ад гэтага не ўратуецца нават хітры,

Той, што звініць грашыма.
І я скручу некалі шыю
У адной з авантур звычайных. Але не ад суму.
Вуснаў тваіх дакрануцца
І болей не азірнуцца.
Абагаўленне іроніі. Восень. Думай.

* * *

Ці зведалі вы, як спыняецца сэрца
Пад ціхі і роўны гадзінніка стук?
У цёмны пакой расчыняюцца дзверцы
І ценяў начных пачынаецца рух.
Вярнуцца з нябыту агтошняя спроба,
Але аддаляецца вогненны шар.
Апынуцца нечыя постаці побач,
Каб лашчыць далоні і вусны, і твар.
Атручана цела чароўным напоем,
Банальнаю пометай за спынены крык,
Ці зведалі вы запаветнасць спакою,
З якой пачынаецца іншы адлік?
І ўжо не замуцяць абрыс у люстэрцы
Ні подых, ні дотык. Паверхня блішчыць.
Вось так непазбежна спыняецца сэрца,
Якое нарэшце стамілася жыць.

**Авалодванне**

Гэта не сум і не пустэча —
гэта святло працінае лісце
і ледзь-ледзь дакранаецца да зямлі,
гэта вада збірае каменьчыкі,
каб потым выкінуць іх на ўзбярэжны пясок,
гэта памяць фільтруе час, пакідаючы толькі існае,
гэта вецер спрабуе адчыніць вокны дома,
у якім застаўся толькі стук сэрца,
гэта адчуванне бязважкасці і абвостранага слыху,
гэта дадзенае, ад якога нельга пазбавіцца,
але прыцісну тыя яго цяжарам могуць упасці.
Каб не згубіць вышыню, паглядзі сабе ў вочы.
І, пабачыўшы адзін раз
увасобленую моц вызваленай энергіі,
ты не зможаш адмовіцца ад таго, што яе
нараджае.

Не бойся.
Гэта не парушэнне раўнавагі,
гэта ўзмацненне гармоніі.
І акаляючыя цябе людзі і рэчы
любой сваёй выявай уздымуць цябе яшчэ вышэй.

А пасля таго, як пачуцці ператворацца ў словы,
яны пакінуць цябе, каб вярнуцца і нагадаць —
ты ёсць!

* * *

Мой нерэальны свет, мой сон,
мае імкненне ў вышыню,
Мая нястрыманая мара,
Як продкі пакланяліся агню,
Як неслі да яго свае ахвяры,
Так я імкнуся да твайго цяпла,
Схіляюся перад тваёю сілай,
Каб у маіх далонях ажыла
Палёту прага над штодзённым шэрым пылам.
Ты спі, шукальнік шчасця і прыгод,
Нязмораны шляхамі падарожнік.
Спыняе час хаду сваіх турбот
І стрэлкі пераводзіць асцярожна.
І адыходзяць сум і мітусня
За край зямлі, дзе захад сонца тушыць,
І застаецца толькі цішыня
У дзвюх асветленых каханнем душах.

* * *

не будзе ні слыху ні ўздыху
ні цемры ні памяці
ні святла ні спакою
толькі зрыжэлы папірус

не будзе ні крыку ні голасу
ні тлуму ні хаосу
ні літанняў ні роспачы
толькі ззянне бурштыну

не будзе ні смутку ні клопату
ні адлегласці ні далягляду
ні колеру ні пяшчоты
толькі кінуты пэндзаль

не будзе ні міласці ні радасці
ні пошукаў ні ўтрапення
ні вышыні ні часу
толькі рэшткі гадзінніка

не будзе ні краін ні народаў
ні зямлі ні неба
ні зор ні сусвету
толькі твае вочы

* * *

Зоры падалі, згасалі,
Прабівалі караблі.
Дзве жанчыны сумавалі
Над прасторамі зямлі.
Раздзялілі іх турботы,
Лёс, краіны і гады.
Раздзялілі назаўжды,
Раздзялілі назаўжды.

Неадольна і адчайна,
І не адарваць рукі,
Час ад часу іх злучаюць
Тэлефонныя званкі.
То адна, а то другая
Будуць нумар набіраць,
Ды няма чаго сказаць,
Ды няма чаго сказаць.

Ах, як склалася няўдала,
Невядома з-за чаго
Дзве жанчыны пакахалі
Чалавека аднаго.
Ўсё, здаецца, так трывала,
Што нічога не змяніць,
І не варта больш маніць,
І не варта больш маніць...

За далёкаю дарогай,
За далёкаю смугой,
Дзе і неба, і разлогі
Выпраменьваюць спакой,
Сэрца сцішыцца ў самоце
І не будзе грукацець,
Бо няма куды ляцець
І няма чаго хацець.

Летніх гукаў пералівы
З надвячорка да відна,
Ўсё дарэмна, бо шчаслівай

З ім не будзе ні адна.
Дзе ж знайсці такую сілу,
Каб каханне адпусціць
І далей працягваць жыць,
І далей працягваць жыць.

* * *

*Т.Ш.*

Да споведзі страты і ціхай пакоры
Далучыцца дзень невыразнай праяваю,
І мы паплывём да Паўночнага мора
Туманнай ракою, шчымліва-ласкаваю.

Агучаны будуць халодныя воды
Слядамі паломніцтваў, рэха вяртаннямі
Насустрач дажджам і цяжкім параходам,
Насустрач гульні з учарашнімі зданямі.

Будынкаў цагляных заблытаны шэраг
Захоўвае згадкі пра свята мінулае,
Там брук у шматках каляровай паперы,
Там лялькі, што нас адпускаюць расчулена.

Партовага горада шпілі імклівыя.
Забыцца на ўсё — на журбу, на дакоры.
Мы будзем шчаслівыя, вельмі шчаслівыя.
Мы ведаем шлях да Паўночнага мора.

**Cortona**

Ля ног раптоўна апынуўся цэлы свет —
Пластычных вулачак лагоднае маўчанне,
Раслін пакорлівых гарачае дыханне,
Званіц далёкіх дасканалы сілуэт.

У неабсяжнасці прасторавых шляхоў
Не існуе ніякіх вымярэнняў,
І птушкі цень затрыманым імгненнем
Апусціцца на вечнасць камянёў.

І вольны вецер пераменлівых забаў,
Насычаны кавярні горкім пахам,
Як па прыступках, па чырвоных дахах
Збягае ўніз і туліцца да траў.

Душы сугучнасць і яе працяг —
У цэгле, бруку, дрэве і граніце,
І сонца, распластанае ў зеніце,
Не сочыць за наяўнасцю быцця.

Неверагоднай радасці крыло
Абараняе ад вачэй староннiх.
Мае далоні на тваіх далонях.
Да вуснаў вусны. Да святла святло.

* * *

Жоўтая ноч. Поўню-сланечнік
Неслі аблокі ў вырай пялёсткавы,
І падымаліся заклікам вечным
Рукі людскія па літасці боскія.
Гэтую ноч мілавалі адчайныя,
Песцілі ў думках сваіх асцярожныя,
Волі таемнай былі падначалены
Дрэваў гайданне і шэпты трывожныя.
Хто цябе сэнсам напоўніў загадкавым,
Казка жаданняў, песня вандроўная,
Доўгі палёт між дакладным і згадкамі,
Лёс пераменлівы, сілы няроўныя.
Можа, адплацяцца спевы журботныя,
Можа, пачуюцца слёзы гаючыя.
Круціцца свет, быццам зьнічка самотная,
Да цішыні і чакання прывучаны.
Толькі ліхтар патаемнаю звадаю
Пераплятаецца з цемраю сіняю
І асвятляе пяшчотнай спатадаю
Цела твайго гарманічныя лініі.

* * *

Яны ідуць упэўненай хадою,
Я разам з імі. З імі — і ў баку.
Пад веснавой бліскучаю вадою
Я падаю людзям сваю руку.
Напоўненыя маем ручаіны
Збягаюць серпанцінам залатым.
Быць мудрай — гэта значыць, быць жанчынай,
Каб дараваць і вялікім, і малым.
Жаданне, што прываблівала ўчора,
Апошняй прыгажосцю прамільгне,
І вось перада мной празрысты горад,
Які цяпер належыць толькі мне.
Тут дзверы расчыняюцца гасцінна,
А я чамусьці стоена шапчу,
Што я кахаю гэтага мужчыну,
Што іншага мужчыну не хачу,
Што не прашу дапамагчы нікога,
Бо вырастае крыллем за спіной
Усведамленне ўласнай перамогі
Над лёсам, над людзьмі і над сабой.
Ляцець у свет — каханай і адзінай,
Знаходзіць шчасце ў клопатах зямных?..
Быць моцнай — гэта значыць, быць жанчынай,
Каб бараніць і вялікіх, і малых.

*Chopo y torre.*
*Sombra viva*
*y sombra eterna.*
*Sombra de verdes voces*
*y sombra exenta.*
*Frente afrente piedra y viento,*
*sombra y piedra.*

F.G.Lorca

# І ЎЗЫДЗЕ ПРЫГАЖОСЦЬ...

* * *

Трапяткі і пужлівы, быццам сон на світанні,
Быццам голас далёкі, быццам радасць шляхоў.
Свет, схаваны ў галінах, — карагод абяцанняў —
Разбурае наяўнасць непатрэбных высноў.

Перад кожным вяртаннем, перад кожным сыходам
Твой уважлівы позірк спыніць простая рэч —
Свет, схаваны ў галінах, — увасобленасць згоды,
Гарманічных пачуццяў і прыязных сустрэч.

Нетаропкім гайданнем, пераборамі ценю
То наблізіцца сонца, то адыдзе назад,
Слізгане зіхаценнем па плячах, па каленях,
Зачароўвае цела, робіць млявым пагляд.

І на самым падмурку знітаваных імпрэсій
Паступова ўзнікаюць твары новых краін.
Пахі ўсходняга ветру, цыганскія песні,
Покліч снежнага барса і грукат лавін.

Я на плямцы святла высвятляю залежнасць
Запаволенай думкі і добрых прыкмет,
І гляджу, як за промнямі цягнуцца вежы
У бліскучую далеч, у нязмушаны свет.

* * *

Бессмяротную восень
Агаляюць вятры.
Ты нічога не просіш,
Ды аднойчы — «бяры».

З ранку сум да знямогі,
Прачынаецца свет,
І кладзецца пад ногі
Мой шчаслівы білет.

Не вагаюцца шалі,
Не чуваць галасоў
Верасовага жалю
І бясконцых лясоў.

Паглядзець застаецца
Развітальна на ўсход,
І трывожна заб'ецца,
Задрыжыць самалёт.

І ўздымаючы крылы,
Цяжкім лётам сваім
Разразае штосілы
Першы восеньскі дым,

Летуценнага краю
Небасхіл дарагі,
І чамусьці сціскае
Да пякучай тугі

Страх, што я не вярнуся,
Адчуванне віны,
А над Белаю Руссю
Туманы, туманы...

* * *

У пошуках блакітных сілуэтаў
Імкнуцца вочы ахагііць прасцяг,
І словы пераўзыдзеных сюжэтаў
Знікаюць з хуткаплыннасцю быцця.
Напоўненая радасным спакоем
Зіхоткага паветра чысціня.
У зменлівасці сонечных настрояў
Мінае час і вабіць вышыня...
А над Міжземным морам аблачыны
ГІлывуць, як шмат гадоў таму назад,
Пра што ж сумуеш, юная жанчына,
Калі глядзіш за гэты далягляд?
Пра тое, што сядзіць у сэрцы стрэмкай
Пяшчотны боль, нявыказаны верш,
Што ты заўсёды будзеш чужаземкай
Для ўсіх, а для самой сябе найперш?
Што недзе без паўднёвых дэкарацый
Ёсць край самотны ў восеньскай слаце,
І да яго — крычаць не дакрычацца,
І да яго — ляцець не даляцець...

* * *

Заснуць ля гэтых камяніцаў
Над краем неба залатым...
І будзе доўга-доўга сніцца
Чароўны вобраз пекнаты.
Сярэднявечным рэхам гулкім
Нястомны вершнік пакрысе
У змрочны дзень сырых завулкаў
Святло і сон твой панясе.
І будуць белыя фіранкі
Імкнуцца ў сонечны блакіт,
І будуць юныя каханкі
Міжволі стрымліваць свой спрыт.
І наддалёкаю вадою,
Над сходамі манастыроў
У міласэрнасці спакою
Заціхнуць плоймы галубоў.
На зморшчынах старога места
Усмешкі водсвет мільгане,
І будзе доўжыцца сіеста,
І будзе доўга сніцца мне.

## Rocca Paolina

Кожны раз мінаеш сутарэнне —
ГТаглядзець, як па аліўкавых пагорках
Дзень сыходзіць хваляй ясна-горкай
У даліну спыненага часу
І лагодных сноў паразумення,
Над якімі расплялася прахалода,
Мноства стужак уздымаюць водар
Асцярожных сакавіцкіх красак.

Кволаю рэальнасцю зямною
Спалучаюцца майстроў ініцыялы
З надпісам графіці нетрывалым
На аблашчаным святлом камені,
Ціхія арганныя настроі
Застаюцца ў таямніцах небакраю.
Голуб паліфонію стварае…
Кожны раз мінаеш сутарэнне…

**Па спіралі…**

І будуць разгортвацца драмы,
І будзе звінець зарапад,
І пойдзе жанчына праз браму
У шэра-блакітны сад.

Наперадзе — кветкі вяргіні,
Далоні халоднай травы,
Крыло матыля ў павуцінаі,
Акно занядбалай царквы.

Ледзь чутныя гукі замовы
Адзначаць нязведаны шлях,
А вецер шыфон ліловы
Кранае на голых нагах.

Сабраныя нейкім зярняткі
Блішчаць у святле зараніц,
І казку раскажа спачатку
Вядзьмаркай навучаны прынц.

Ён так непрыкметна сурочыць
Каханнем на свежай раллі,
Каб шэра-блакіных вочы
Усю сваю моц аддалі.

* * *

Тонкім пальцам водзячы па шкле,
намалюеш шмат знаёмых рысак,
з іх раптоўна нейчы твар складзецца,
і яго такі нахабны выраз
перакрэсліць сотню намаганняў
абыякаваю стаць, сабою,
ці адною з інтэлектуалак —
адпаведнасцю венецыянскіх масак, —
што таніiуюць ліха на паверхні
і ніколі не чапляюцца за сутнасць.

Тонкім пальцам водзячы па шкле,
можна паднавіць узор стандарту,
некалькі акрэсліць траекторый
кулі і шляхоў да акіяну,
каб пасля лягчэй было змагацца
за свае ўласныя стварэнні,
вольнасць выбару сваей асобы,
на якую ўздзейнічаць спрабуюць
прапаганда, восень і рэклама;
а калі узнікне адчуванне
пераходнасці любога стану —
з асалодаю паставіць кропку
і пакінуць марнатраўства часу.

* * *

Запрашальным, чароўным, лірычным
Падаюцца святло і настрой,
І кактэйль з мяккім смакам сунічным
Узбуджае, бы боскі напой.

І заходзіць сюды асцярожна,
Баязліва глядзіць па баках
Спапялёны жаданнем трывожным
Чалавек, што жыве толькі ў снах.

Ён прыходзіць, каб знікнуць хоць трошкі,
У люстэрках сябе прыхаваць;
Тут карункавыя панчошкі,
Тут паблажліва вусны блішчаць.

Ён не можа, ён болей не можа
Быць пристойным і ў думках грашыць.
Здрада — што гэта — думка ці ложак?
Цнота цела і бруддушы?

Ці то фікцыя, ці дабрадзейнасць?..
Толькі ціха мінаюць гады.
Ад пакуты сваёй безнадзейнай
Ён ідзе кожны вечар сюды...

* * *

Па-над прыцемак сумненнем,
Па-над сцішанасцю сліваў
Прагны покліч вызвалення
Набліжаецца імкліва.
Блаславёна рыпнуць дзверы
Міждрымотным калыханнем,
Неакрэсленая вера,
Нечаканыя жаданні.
Па каменьчьжах шурпатых,
Па ружовым беражочку
Пабяжыш ад роднай хаты
Ільняную слухаць ночку.
І ў вільготныя абшары,
І ў абуджаныя пожні
Голас твой здзяйсненнем мары
Уварвецца пераможна.

**Дубль 1**

Аднойчы маленькай дзяўчынкай,
якая толькі-толькі вывучыла
асноўныя дзеянні матэматэкі,
я круціла «вечны» каляндар
і думала: у двухтысячным годзе
мне будзе трыццаць.
Непадуладная дзіцячаму ўяўленню
лічба не выклікала асаблівых эмоцый,
адно цікаўнасць: якой я стану?

**Дубль 2**

Праз два гады мне будзе трыццаць
і надыйдзе трэцяе тысячагоддзе.
Я ведаю шмат розных рэчаў
патрэбных і не вельмі:
ведаю, як прыгатаваць вячэру
і намаляваць світанак,
ведаю, хто заказвае музыку,
і куды вядуць усе шляхі.
Я нават сама па іх хадзіла.
Але што змянілася: змест ці форма?

**Дубль 3**

Канец дваццатага колца:
усюды пра мастацтва «пост»
і пра постсвядомасць,
постіндустрыю і постэпоху.
Гэта значыць – усё ўжо было?
І я толькі копія?
Суцэльны *post scriptum*?
Я не хачу жыць постжыццём,
закрэсліваць каштоўнасць часу,
з якім супадаю ў прасторы.
Я належу рэальнасці
перад новым імгненнем,
перад новым тысячагоддзем,
рэальнасці "*prima di...*"

* * *

Па сутнасці — радасць, па выглядзе — шчасце
Аднойчы складзецца і ўжо назаўсёды,
Пад белым шыфонам схаваныя жарсці
Цяпер не парушаць сусветнае згоды.
Кароткія словы, імклівыя рукі,
Зямля раскрывае дрыготкае ўлонне,
Сціраюцца твары, сціраюцца гукі
У белым шыфоне, у белым шыфоне.
Прасцёртых далоняу шляхі і сцяжынкі,
Злятаюцца ластаўкі на падваконне,
І круцідца лісце, лядяць парушынкі
У белым шыфоне, у белым шыфоне.
Ддзінай дарогай, адным разумением,
Куды тваe мары, пялёсткі на скронях,
Пялёсткі на вуснах, пялёсткі праменяць
На белым шыфоне, на белым шыфоне...

**Трыяда**

Калі ты вернется,
і мы будзем кахаць
адно аднаго,
не запальвай святла.
Я не хачу бачыщь тваіх вачэй.
Я баюся прачытаць у іх
нешта,
напісанае не маёю рукою.

Калі ты вернется,
і твой абрыс на белай прасціне
запалоніць зноў маю істоту,
не пакідай мне часу
на роздум.
Я баюся пачуць чужыя крокі.

Калі ты вернется,
то не запальвай святла
і не пакідай мне часу
на роздум.
Нагадай мне толькі,
што і святло, і час,
і непазбежнасць —
ёсць ты і я.

* * *

Рыбінай на беразе пустэльным
Заціхае той далёкі дзень
У якім і мроі і рэальнасць
Трызненнем зрабіліся суцэльным

Хто яны ля самае вады
Гэтыя нязручныя музыкі
Аніякіх пераможных маршаў
Толькі глуха тахкаюць гады

І збіраюцца сюды з-за дзюнаў
Розныя марскія чарапахі
Статкі крабаў з зоркамі на спінах
Запаўзаюць пад абломкі шхуны

Парушаеш быццам незнарок
Цішыню і роспач адмаўлення
Пад тваімі босымі нагамі
Мёртвы калыхаецца пясок

* * *

Год за годам, крок за крокам спалучаюцца імгненні,
Спалучаюцца памкненні ў ланцужок бесперапынны.
А пабітыя далоні, а падраныя калені
Загаіліся патроху і трывожыць не павінны.
Ад самотнай весялосці да вясёлае самоты
Дацягнуцца вельмі легка, вельмі легка пераскочыць.
Я ізноў сачу за небам у чаканні самалёту,
Я ізноў гляджуў прастору, што міжволі слепіць вочы.
Мне не дадзена патрапіць у зададзеную кропку,
Мне не дадзена спасцігнуць ні наступстваў, ні прычыну.
У чаканні самалёту час бруіцца нетаропка
І адсоўвае на потым вырашальную хвіліну.
Разгарнула бездань рукі, загайдалася калыска,
Я хачу сказаць «кахала», ды ізноў кажу «кахаю».
Адгукаецца вятрыска, голас нізкі, неба блізка,
Можа, ўбачу твар знаёмы сярод тых, хто сустракае...

* * *

Грымотны дзень. І сон з грымотных дахаў
Высочвае разбэшчаных істот.
Гарачыня агортвае ахвяр. Сляпыя цені,
бы з пакою жахаў,
Выконваюць усё наадварот.

Грымотны дзень. Абвергнуць прыналежнасць
Пакуль яшчэ недастаткова слоў.
Гарачы дах. Безабаронная залежнасць.
Адсутнасць мовы. Маляўнічасць сноў...

* * *

Аніякіх прадчуванняў —
Ні пакоры, ні дакораў,
Я жыву ў зачараванні
Гарманічнасцю прасторы.
Галасоў сугучча звонкіх,
Шамаценне ліп ля дому,
Мне дае сваю далоньку
Нейкі хлопчык незнаёмы.
Свет — ад Бога і да Бога.
Мо спакой завецца раем?
Я не ведаю нічога,
Я нічога не чакаю.
Ціха-ціха ў нашай хаце
Ды чуваць, як б'ецца сэрца,
Бо душа майго дзіцяці
Ўжо пастукала ў акенца.

* * *

кожны тыдзень — прыступка
на якую павольна ўзыходзіш
кожны тыдзень як парастак
прабіваецца ў неба
і таму ля цябе завіхаюцца
непрыкметныя с.лужкі-анёлы
днём гуляюць з праменнямі сонца
уначы калыхаюць гардзіны
дабрынёй насычаюць паветра
каб утульна было і спакойна

Бог ахоўвае крокі жанчын
якія ведаюць
што ў іх народзяцца дзеці

* * *

выплываюць з віроў глыбокіх
расцвітаюць на сіняй вадзе
кветкі лотасу

выгарэзваюць між сцяблінамі
ловяць сонца бакамі бліскучымі
рыбкі дробныя

уздымаюцца хвалі светлыя
дасягаюць туды дзе песціцца
лісце цёплае

за штуршком штуршок пачынаецца
мяккім дотыкам мой малюсенькі
прачынаецца

* * *

Ноч звініць над нашай хаткай,
Ля тваіх стаіць вачэй.
Спі, дзіцятка, спі, зярнятка,
Засынай, сынок, хутчэй.
Дд матулінай усмешкі
Выпраўляйся ў доўгі шлях
Можа, конна, можа, пешкі
Вандраваць па дзіўных снах.
Аксамітныя дубровы
Рассыпаюць жалуды.
Па кілімах адмысловых
Зоркі коцяцца сюды.
Іх у кошык пазбіраю —
Будзе заўтра з чым гуляць.
Ручка цёплая малая
Стала пальцы мне сціскаць...

Кожны вечар блаславенне
Мілагучнай цішынёй...
Проста ты сваім з'яўленнем
Нейкі цудзрабіў са мной.
У маладзіковы рожкі
Захінуў фіранкі край.
Я тваe цалую ножкі
І спяваю: «Баю-бай».

* * *

Там за небакраем тысячы дажджоў
у непрадказальнасці застылі
Там за небакраем мноства голых дрэваў
жаляцца на хуткае растанне

А бурштынавыя бліскавіцы
абпалілі ўночы аканіцы

Між зямлёй і небам тонкая мяжа
пракладзецца крышталямі лёду
Між зямлёй і небам срэбныя званочкі
кожны вечар будуць нам звінець

А бурштынавыя бліскавіцы
бы нястомленыя вартаўніцы

Там за небакраем часу далячынь
страчвае знаёмыя абрысы
Пад ссівелым сонцам неба і зямля
адгукаюцца тваім усмешкам

А бурштынавыя бліскавіцы —
прывітанні феі-чараўніцы...

* * *

Так абачліва і далікатна
Адыходзіць месяц лістапад,
Пакідаючы ў жыцці прыватным
Тое, што і годтаму назад.
Прымаразак высвенціць прысады,
Нетаропка разгарне сувой,
Падрыхтуюць мастакі прылады,
Узмахнуць умелаю рукой -
І паўстануць помазкам алею
Рэкі ў сузіранні берагоў,
Сцятыя халодныя алеі,
Лабірынты лёсаў і шляхоў.
Пад снягамі сцішацца лагчыны,
Вецце паслухмяна задрыжыць,
І пачнуць самотныя жанчыны
Уначы на каве варажыць
І шукаць якога-небудзь ладу
Для неўладкаванага жытла.
Неба напярэдадні Калядаў —
Быццам брама вышняга святла.
Не схавацца ў глыбіні прадоння,
Сум не хоча спасцігаць прычын,
І глядзіць спагадліва Мадонна
На пакуты вечныя жанчын.

* * *

Асветленая зоркаю Антарэс,
Акрэсленая вуснамі вятроў,
Душа мая імкнулася да мараў,
Як да зыаёмых змалку берагоў.
І там, куды ні крока, ні паўкрока,
Куды не клаўся чалавечы след,
Я назірала асаблівым зрокам,
Як запавольвае свой рух Сусвет.
Як крышацца няспраўджаныя зоркі
У сутарэнні прывідных палёў,
Я к расчыняюцца начныя форткі
І выпускаюць сініх матылёў.

*Можа, то не сон —*
*Гэты дзіўны звон?*
*Сінь-сінюткае*
*Крылле гнуткае,*
*Адгукаецца,*
*Не чакаецца.*

У веснім небе сонца парушынкі
Закруцяцца і лягуць на далонь,
І мноства пératворыцца ў адзінкі
І выпадзе імклівае сціло.
Напэўна, будзе ранак палыновы,
Напэўна, будзе голас над вадой...
Я ведаю, што застануцца словы
Адлюстраваннем існасці маёй.

* * *

Над далінай вятрам наўздагон
Іншым разам так хочацца ўзняцца,
І — назад, у спрадвечны палон —
Быць дзяўчынкай і быць маці.

У прычыненыя дзверы назіраць,
Як спрабуе сам на ножкі ўстаць
Сэнс жыцця — з блакітам шэрым вочы
І смяяцца, і не спаць уночы.

Нетутэйшай расіцы сляды
На асфальце знаходзіць нязменна,
Засяроджваць у кроплях вады
Патаемнасць усмешкі імгненнай,
Узнікаць між вясновых садоў
На празрыста-ружовых суквеццях
Дзеля некалькіх толькі радкоў,
Што табе
закаханы
мужчына
прысвеціць...

* * *

Гэта прыцемак вясновы
Забруіўся па пакоі
Гэта лёгкі пах хваёвы
Над маёю галавою

Гэта колераў адценні
Выяўляюцца яскравей
Гэта некалькі імгненняў
Паміж сном і паміж явай

Гэта слухаць як сініцы
Забаўляюць шматгалоссем
Гэта расплятаць вучыцца
Промняў зблытаныя косы

Гэта дзед мароз старэнькі
У апошні раз марозіць
Гэта голыя каленкі
Гэта коўдра на падлозе

Па-за сэнсам па-за слыхам
Сонца цёплага з'яўленне
І тваім дыханнем ціхім
Пачалося абуджэнне

**Эміграцыя**

І ты таксама можаш птушкай стаць
І ў казку можаш паляцець лясную,
Схавацца ў гушчары ад розных злыдняў
І ў нізкі вершаў згадкі нанізаць.
Не бачыць там бетону і цэменту,
Не чуць выслоўяў п'яных маргіналаў,
Не думаць пра няўпэўненае заўтра
І не лічыць ні сотняў, ні адсоткаў...
*гуляла паванька ў саду па саду*
*раняла пер'ейка у зялёну траву*
Тут можна без залішняй гаманы
Заглыбіцца ў эстэтыкі каноны,
Наблізіцца да сутнасці мастацтва
І красамоўства формы спасцігаць,
І, пакідаючы жыццё далёка,
Пазбавіцца ад непатрэбных думак
Наконт абмежаванасці прасторы
І немагчымасці тваіх уплываў.
*не жаль мне паванькі ні пер'я ў траве*
*а жаль мне сястрыцы ў чужой старане*
Яшчэ ты можаш эмігрантам стаць,
Пераляцець за горы ці за мора,
Перамяніцца цалкам ці часткова,
Чужую мову ўрэшце зразумець;
Забыць святло чарговых феерверкаў,
Або ствараць інакшую рэальнасць
Амаль што без надзей яе пабачыць...
І дзве твае душы самотна плачуць.
*як трудна рыбаньцы ў мутнай вадзе*
*так маёй сястрыцы ў чужой старане...*

* * *

І ўзыдзе прыгажосць
над горадам і светам,
над попелам і жарсцю,
над верай і сумненнем.
І ўсе раптоўныя «няўжо»
знямеюць перад гэтай ласкай
і аддадуць яе вяршыням
кароткі момант разумення.

І спраўдзіцца твой знак
наконт лагодных рухаў,
наконт ашчадных словаў
над сіняю прасторай.
І гэта будзе так,
як вольных сэрцаў грукат,
упэўненых, як смех,
і як палёт кандора.

* * *

Ні попелу духмяных цыгарэтаў,
ні паху далікатнае парфумы,
а чыстае і звонкае паветра
і восень, восень — лісце залатое.

Глядзі, як прачынаюцца дарогі,
як птушкі выбіраюць накірунак,
як астывае філіжанка кавы
сярод гераняў ранішняй тэрасы.

Як сэрца — папяровы самалёцік —
вяртаецца назад з краіны згадак
і дорыць непрадбачаныя фарбы,
і дорыць непрадказаныя словы.

Рапсодыя без роспачы і смутку,
без прабачэнняў і расчараванняў,
бы краявід старых майстроў фламандскіх,
бы вытанчаны верш класічны.

І восень, восень, мяккія сцяжыны,
палёту цень у неабдымным небе
і струмяні халоднага паветра
вакол тваіх задумлівых далоняў...

* * *

Белы палац у раскошы нябачанай
Я абыходжу імкліва.
Столькі пакояў табою адзначаных,
Крокам тваім шчаслівым.
Сонца праменні слізгаюць зладжана
Па-над каменнем плыткім.
Што ж, і гарэм твой будзе прададзены
Разам з усім набыткам.
Срэбных тканінаў цяжар хістання,
Сумма гіяе акарына,
Толькі ці варты такіх намаганняў
Просты смяротны мужчына?
Думка нязвыклая, думка крамольная —
Плынь у паветры статычным.
Мабыць, адзіная рэч каштоўная —
Куфэрак працы антычнай.
Гэты куфэрак, старанна замкнёны,
Я адмыкаю ўпотай.

Ззяе пярсцёнак цара Саламона
Сярод непатрэбных бразготак...

* * *

У галерэі маленькіх кавярняў і антыкварных
крамаў,
дзе твары хаваюць ад сонца парцалянавыя
паненкі
і пекнымі ручкамі разгладжваюць
парцалянавыя сукенкі
а іх кавалеры сумуюць у залацістых рамах,
дзе пахаваны ў шырокіх вітрынах настрой
дэкадэнцкі,
а медныя кандэлябры ўзгоркі пылу збіраюць,
і чытачамі цікаўнымі мроіць пажоўклая кніга
старая,
прамень, пасланы люстэркам, заблытаўся
ў вазах багемскіх

Поўдзень.

Людзі спяшаюцца знікнуць. Збавенне —
Шклянка вады з лімонам.
Вабіць прытулак рэдкага ценю
Пахамі кардамону.
Гарачыня, як вердыкт канчатковы,
Тут прыпыняе паэтаў
Вершы пісаць на шматках выпадковых,
На каляровых сурвэтах.

* * *

З гэтых паштовак далёкіх і блізкіх краіыаў,
так нечакана з'ядназаных маёю прысутнасцю,
зрэдку здзімаецца пыл дарагіх успамінаў,
зрэдку чытаюцца смешныя хуткія надпісы.

Так і ляжаць, некранутыя часу размовай,

дождж,
у якім прачынаюцца словы,
снег,
у якім прачынаюцца словы,
лісце,
у якім прачынаюцца словы,
поўня,
у якой прачынаюцца словы.

*...ilyavait unpauvre type quis 'etait trompe de monde.*
*IIexistait, commeles autresgens, dans lemonde*
*des jardins publics, des bistrots, des villes commerçantes*
*etilvoulaitsepersuaderqu'ilvivaitailleurs, derriere*
*la toile des tableaux, avecles doges du Tintoret, avec*
*les graves Florentins de Gozzoli...*

J.-P.Sartre, La nausee

# СУМНАЯ МЕЛОДЫЯ
# 2002

* * *

Зноў на лесвіцы п'яны нябога.
Тэлевізар рагоча заўзята.
Надвор'е не абяцае нічога,
Акрамя навагодніх святаў.
Ці да лепшага штось перавернецца —
Абсалютна пакуль невядома,
Бо смярдзіць, як звычайна, сметніца
Каля сто дваццаць пятага дома.

* * *

Круціцца б на лісце гарлачыку
у плыні нетаропкае ракі
і разглядаць бясхмарныя
нябёсы
праз слюдзяныя крылцы страказы
што так здрабняюць ліпеньскае
сонца
а ўсе экзістэнцыйныя пытанні
пакінуць хвалям птушкам і
раслінам
што не пакутуюць ані хвіліны
дзеля чаго з'яўляюцца на
свеце

* * *

Праз шэраг непазбежных дат —
то радасна, а то — з няёмкасцю.
Як быццам здзейснены загад,
і цішыня такая стромкая.
І ў гэтай доўгай цішыні,
другімі фарбамі расквечанай,
не адгукаюцца званы,
а пыл ляціць іржавым вечарам.
І на ядлоўцавых кустах
сівыя бубкі не варушацца,
і пыл знікае на вачах
за пасівелаю ігрушаю.
Замкнёны весніцы як след,

і шар паветраны зніжаецца.
І толькі нечы сілуэт
сюды павольна набліжаецца.

* * *

дождж не мае пачатку дождж не мае канца ён плыве над зрыжэлымі дахамі ён трымае хвіліны пад пахамі ён ціхутка сядзіць пад карчамі ён стварае тваімі рукамі абразы што за хмарамі бачацца ён гучыць метраномам і значыцца ён захоўвае рытм тэлеграфны ён цябе падзяляе на графы у якія не будзе ўпісана ні сузор'е ні імя аксана толькі лічбаў шыхты беспрасветныя і радкі пераможцаў газетных гэта студзень такі пакалечаны з-за адсутнасці сон ца прыгнечаны і дажджы непралазныя слізкія пры ляцелі з вятрамі балтыйскімі

* * *

Вечар топіцца ў самоце,
захлынаецца прасцяг,
нехта ходзіць па балоце
з запальнічкаю ў руках.
І ад краю і да краю
на зляжалы чорны лёд
боты нечыя ступаюць
і штурхаюць крыгаход.

* * *

цішыня пустых квадратаў выпраменьвае спакусу
застацца і не думаць пра тое
што трэба зрабіць
што неабходна зрабіць
што немагчыма не зрабіць
хай будзе вада
хай вырашае каму адыходзіць
каму падстаўляць далоні
ніхто не будзе пакутваць ад невядомасці
кожны ўбачыць тую каляіну
па якой пойдзе яго свядомасць
да першапачатку

* * *

за кожным ліхтаром — Поўня
за кожнай кветкай — Сонца
за кожным дзіцёнкам — мама
галоўнае — абароненасць

* * *

Ён сочыць за тваімі рухамі
І ўзбуджаецца раптоўна,
І мармытаннем малітоўным
Паветра сонечнаець парушана.
А з-пад зямлі гучыць настойліва
Падковаў конскіх грукат жвавы,
І сонца — як імгненне славы
У свеце хісткім і няўстойлівым...

* * *

я плыву на хвалях ветру
да зялёнае мяжы
на бурштынавых аблоках
выяўляюцца крыжы
і вачыма птушаняці
пазіраюць гарады
палатняныя кашулі
рассцілаюць ля вады
ляжа складзеная ў куфар
мудрасць прадзедавых кніг
гул далёкага змяркання
насцярожваецца слых
і падхопленая хваляй
не сумуй і не тужы
я плыву ў струменях ветру
да зялёнае мяжы

* * *

Пакінуць некалькі радкоў
на аксамітным пергаменце,
на бяросце патрэсканай,

на камяні гранітным.
Пакінуць неразгаданымі...

Пакінуць некалькі старонак
і ягады чароўных гронак
на радасць смелым вераб'ям
і адляцець туды, дзе мора,
ці, ў горшым выпадку, азёры,
прыемны краявід вачам.

Пакінуць некалькі усмешак
і на талерачцы арэшак,
але зусім не залаты,
пакінуць выцвілыя зёлкі,
пакінуць нітачкі ды голкі.
мінулагоднія лісты.

Пакінуць радасці агеньчык
і эбанітавы грабеньчык,
і рукапісы — назусім.
І цэлы свет як на далоні —
лясы, лугі, палі і гоні.
*Arrivederci.*
Вам усім.

* * *

сказаць няпроста і пайсці няпроста
хоць нехта просіць закахана
у выніку прычын адрозных
узнікне пустка нечакана
краіна жоўтага абшару
краіна зменлівых намётаў
і неба без адзінай хмары
і незалежнасць і самота
перад сабой цябе штурхаюць
да вызначальнага бар'еру
а далей — вуліца глухая
і рваныя шматкі паперы
і надпісы на кожным кроку
папераджальнага значэння

і ўжо зусім навідавоку
пачварны прывід выраджэння

* * *

адчыняюцца вокны мансардаў
і ляцяць саламяныя птушкі
адчыняюцца вокны мансардаў
зіхацяць металёвыя трубы
над майстэрняй дзе фарбы схаваныя ў тубы
патэнцыйна гатовыя выбухнуць колер
адчыняюцца вокны мансардаў
над праспектам дзе тужаць рэкламныя стужкі
дзе мільганню машын не спыніцца ніколі

а па даху ідуць закаханыя
і смяюцца з чужой баязлівасці
і звініць маладосць нечаканая
абыякавая і шчаслівая

і мая астывае кава

* * *

Цацкі без цябе сумуюць.
Як у вядомай гульні пра мора,
яны знерухомелі і чакаюць,
калі ты вернешся з садка,
скажаш чароўнае слова
і дапаможаш ім перамяніць паставы.

* * *

Надыдзе час сказаць, дзеля чаго,
з якою мэтай столькі намаганняў
прыкладзена,
ці будзе ўзнагарода,
і да таго ж яшчэ пачатак года,
і сумная мелодыя чакання
ўсё доўжыцца —
то кропка, то працяжнік, то лесвіца,

то ўздых, то перапынак.
Хто вытрымае гэты паядынак,
хто вытрымае гэтае змаганне?..

* * *

Твае гуманістычныя памкненні,
быццам мухі,
разбіваюцца
аб шыбіну нігілізму,
а ў рэшце рэшт,
хто ты такі,
каб любіць усё чалавецтва?

* * *

Спараджаюцца розуму сном
бессэнсоўныя вобразы-згадкі:
камяні апенінскіх узгор'яў,
рык ільва ў афрыканскай саване,
як спакой, што сыходзіць на рану,
як сустрэча з любімым сузор'ем
і раптоўнага ветру здагадкі,
дзе шукаць свой нязнойдзены дом.

* * *

чорным крыллем BMW адсякае неба ад аўтастрады
між буслоў і дзьмухаўцоў між вясёлак і дажджоў
услед за сонцам якое плыве на захад
віншуем палякаў што цягнуць праз мяжу
скрыні славацкага піва і струдэлю
(натуру не пераробіш) з днём польскай Канстытуцыі
мне радасна ад таго што ў адным з гарадоў
былой Аўстра-Венгрыі я ізноў пачую
святочныя званы

* * *

Неадольным трымценнем напятае аркі
разбураюцца постаці ўяўных палотнаў,

і тады дасягаецца вынік зваротны,
і вясна набліжаецца з тварам гандляркі.
Той, хто зведаў няволю, ахогілены страхам
немагчымасці вырвацца з гэтага кола.
Дзеці спяць. Адарослыя гілачуць міжволі,
а дарослымі круцяць пагарда і Бахус.
Ухапіліся дрэвы за пругкае неба.
Ад зямлі б адарвацца, ды сілы не тыя.
Мы жывем спадзяваннем, што прыйдуць другія
і ўсё стане на месца, і будзе як трэба.

* * *

разглядаць людзей праз шкло кавярні
за хадою іх сачыць расслаблена
занатоўваць постаці і ўражанні
давяраць вачам сляпым ліхтарні
матылёў нявымерлых прывабліваць
здацца самастойнаю і ўважлівай
толькі тут і каралям і пешкам
у праменнях сартраўскай усмешкі

*Hai nelviso calmo un pensiero chiaro*
*che tifinge alle spalle la luce del mare.*
*Hai nel viso un silenzio che prerne il cuore*
*con un tonfo, e ne siilla una pena antica*
*come ilsucco deifrutti caduti allora.*

C.Pavese, Estate

# ГРАНАТАВЫ СОК

* * *

Хочацца зноў у расчыненай далечы
бачыць гуканне вясновага позірку,
дзе надзімаюцца светла-зялёныя
ветразі лісця над хвалямі радасці,
там, дзе вясёлка — чароўнаю брамаю
да дзьмухаўцовага мяккага покрыва,
да мурагоў, у бязмежжа рассцеленых,
травеньскім сонцам лагодным напоўненых.

* * *

Мой недавер з цынізмам на мяжы
і адштурхоўвае, і спакушае.
Але праз сонечную далячынь
ізноў плывуць нязвыклыя аблокі
і формамі сваіх блакітных целаў
нагадваюць карціны маньерыстаў.
Я настаю хвіліну на скале,
а можа, раптам нехта з іх Юпітэр?

* * *

Сэрца
Сэрца
Не балі
Не трэба
Я пайду
У
Памаранчавае
Сонца
Падары
Мне
Словы
Абярэгі
У
Непранікальнай
Абалонцы
Адпусці
Мяне
З тваіх
Кайданаў
Я
Не буду
Рэзаць
Клеткі
Лісця
Дзе
Яна
Славутая
Нірвана

Не балі
Мы разам знойдзем выйсце

* * *

У гэтым горадзе са спыненым дыханнем
адно прыступкамі катэдры крочыць дзень.
І я сама не ведаю кірунку,
не ведаю ні слова, ні паўслова.
Каханне, што мае сціскае сэрца,
пусці мяне, дай выпрастаць мне спіну
і заблудзіцца паміж зеленню каналаў
і чырванню гатычнаю дамоў,
адчуць доўгачаканую свабоду
вакол сябе і ў глыбіні сябе
не ад кахання, не, магчыма,
ад сябе самой.

О, каб ты гэта разумеў, каханы мой...

* * *

Ночы канец, шараватым святлом
Поўніцца свет паступова.
Сноў не было, як і сну не было.
*Incipit vita nuova.*

Белыя сцены і белая столь
Дзеляць жыццё напалову.
Сціхлі і думкі, і радасць, і боль.
*Incipit vita nuova.*

Неба нарэшце мне падае
Сонца прамень выпадковы.
Слёзы мае і слёзкі твае.
*Incipit vita nuova.*

* * *

Па вершалінах спелай канюшыны
мурашкі падымаюцца на неба —
адтуль відаць, як сонца распыляе
сваё цяпло па жоўтых спінках пчолаў.
Мядовы вецер ведае дарогу
за той пагорак, дзе жыве бясконцасць;
струменем тонкім сыпле зерне жнівень
на сцежку каля прадзедавай хаты,
а ты, маё пяшчотнае стварэнне,
нясеш далей душу далёкіх продкаў.

* * *

Трывалы гук выгойдвае дарога,
і так мінае цэлае жыццё:
паміж таполяў, жыта і аблокаў
на дзераўляных вузенькіх мастках.
І што з таго, што побач «Мінск-Варшава»
і з кожным годам болей машын, —
калі струхлелы плот хінецца долу,
а зморшчыны глыбеюць на руках.
Нядзельным вечарам, калі спякотны вецер
напрамак вырашае свой змяніць,
каб даць зямлі хоць трохі прахалоды
і супакоіць ссохлыя лугі,
за весніцамі вёсак занядбаных
пад Божым поглядам нарэшце ажывуць
і выйдуць да калодзежа старыя —
ахоўнікі самоты і тугі.

**4 x 8**

* * *

Кроплі ўзыходзяць і робяцца хвалямі,
і пачынаюць свой шлях да ўзбярэжжа.
І разбіваюцца там пацалункамі
белай скалы і птушынага клёкату.
Ножкі маленькія неабазнаныя
ў спрэчках жыццёвых, у кроках зададзеных,
ловяць імгненне і цешацца пырскамі,
сонечным водсветам, ветрам і каменем.

* * *

Гэтая цудоўная а садка
прывітаннем з ростаняў нябыту
раптам выплыла і заблішчэла
пёркам залатым, гарэзам-эльфам.
Ну, давай, пішы, за словам слова
выкладуцца дзён маіх старонкі.
Хай патаньчыць пёрка залатое.
Купка вераб'ёў на першым снезе.

* * *

Думка, скіраваная ў прастору,
зачапілася за вершаліну дрэва,
загула раптоўна правадамі,
бразнулася ўрэшце на зямлю.
Азірнулася — ніхто не бачыў.
Сцяўшы гонар, паплыла між траваў.
Хто сказаў, што падаць — сэнс палёту,
мы да мэты іншым шляхам пойдзем.

* * *

Вясёлы бог смарагдавых акацый
пакінуў богаўкам спусцелыя галіны
і, ахінуўшыся туманным змрокам,
ціхутка сплыў кудысьці ўслед за сонцам,
і смех яго на вінаграднай гронцы,
на голках піній я знайсці павінна.
Ён зазвініць у мностве варыяцый
і вернецца ў зямлю сваіх вытокаў.

* * *

І я маўчала,
і зямля маўчала.

Мой хлопчык спаў.
Гуляла сонца
струной бяздоннага блакіту,
і не трымцеў ніводнай думкай,
і не мігцеў ніводным словам
застылы мозг.
І сагравала
Душу
падступнае «ніколі».
І толькі крыллем перабітым
нагадвала палёт няўдалы.

А ўнізе,
на раскрытым кніжным полі,
пасопваў мірна
шэранькі ваўчок
і сніў, што не было такога болю,
якога б ён ніяк забыць не мог.

* * *

Што значыць стацца самадастатковай
Здаволіцца адной сваёй прысутнасцю
між кіпарысавых алей і не шукаць
другой душы,
каб праз яе мембраны
імкнуцца свету сутнасць спасцігаць?

Або лавіць і выпускаць каханне,
бы жаўтакрылых матылёў дзяцінства?

А на далонях — толькі жоўты пыл...

* * *

адчуваючы спінаю падлогу
якую павольна штурхае зямля
і фіксуючы пагляд на рэльефах столі
я жадаю толькі аднаго
прайсці праз цябе
быццам радыёактыўны прамень
сатрасаючы ўсе храмасомы
а калі нарэшце атрымаецца
новы чалавек
кахаць яго так як кахаюць мару

* * *

рука расціскаецца
падае кубачак з кавай
на бляск чаравікаў
панчохаў празрыстасць
на мармур падлогі
і злева і справа
дваіцца ў вачах
і пачуццяў дваістасць
такая што болей
трымаць раўнавагу
не могуць ні сцены
ні вокны ў йаўсвету
сурвэтка ўзнімаецца ўверх
белым сцягам
насустрач палону
шалёнага лета

* * *

сексуальнее паветра па-над плошчамі лунае
неба здзекліва праменіць мройнай сонечнасці дым
і без дотыкаў і словаў цела з целам размаўляе
і нябачныя флюіды напаўняюць гарады
а парою вечаровай на старых прыступках лесвіц
у сцішэлых раптам парках запавольваю хаду
ні фантазій ні ўспамінаў мне не хочацца закрэсліць
я ізноў цябе шукаю я ізноў цябе знайду

* * *

Мяне ўсе кінулі усе палеглі спаць,
а я вышукваю ў начных пакоях
той прывід, што параіўся б са мною,
якую зорку сёння назіраць,
якім віном напоўніць цёмны час,
якою музыкай люляць пяшчоту,
а прывід не спяшаецца, і ўпотай
здзяйсняю ціхі паварот ключа...
Якая дэпрэсіўная вясна!..
і вецер, вецер, вецер беспрытульны,
і холадна, і так пакуль няўтульна
між голых дрэўля цёмнага вакна.
І я цяпер магу паспачуваць
самотнікам, што не заснуць паўночы,
і так, напэўна, будзе не аднойчы —
мяне ўсе кінуць і палягуць спаць.
Маіх жыццёвых дасягненняў стос
ураз здрабнеў аддум такіх тужлівых.
Анёл нячутна з крылаў пыл абтрос
і рушыў прэч па вуліцы маўклівай.

* * *

Калі мы вярталіся
з дзіцячага садка,
тата купіў мне кніжку «Знайдзі сузор'і»,
напэўна, дзеля таго,
каб я магла ўбачыць
месца жанчыны на небе.

Там сярод вечнага смутку
яна працірае планеты ад зорнага пылу,
расчэсвае валасы Касіяпеі,
рыхтуе вячэру Блізнятам,
выганяе на пашу Пегаса і Казярога,
збірае ў туманнасцях рэшткі знічак.
А калі нарэшце Сонца кладзецца спаць,
яна аглядае Млечны Шлях,
папраўляе Палярную зорку
(каб ніхто не згубіўся ў акіяне)
і піша гісторыю Быцця
на спіне Вялікай Мядзведзіцы.

* * *

Непераўзыдзены майстар
восеньскіх краявідаў,
падары мне ізноў небакрай.
запоўнены сівай воўнай,
якую прабілі шпілі
званіц і кляштараў,
каб мне з вяршыні нагорка
не бачыць болей зямлі,
а толькі крыжы, што лунаюць
над Тумановым бязмежжам.

* * *

Праз пластыкавыя вокны
такі знаёмы прыпынак
здаецца зусім інакшым,
інакшай здаюся я,
а пластыкавы куфаль піва
і вымушаны перапынак —
усяго толькі дзень падзеі,
паменшанай утрая.
І робіцца відавочнай
нязначнасць быцця і руху,
раптоўна змяняецца ракурс
адрозны свет паўстае,
пад невыразным небам
адно толькі сонныя мухі,
адно толькі сонныя думкі,
і гэтыя думкі — мае.

* * *

Я б хацела з табою прачнуцца
і заснуць, можа быць, назаўсёды.
Выдумляю празрысты экран,
за якім патанаюць імгненні.
Асляпляльная бездань снягоў —
быццам вір незнаемых пачуццяў.
Я слізгаю па схіле зімы,
не знаходзячы пункт прызначэння.
Гэты боль у паветры. Шкада,
што ізноў парушаю дамову.
Шакаладу гарачага пах
паляцеў між забруджаных вулак.
Грукаціць электрычка ўначы,
абтрасаючы срэбныя голкі,
і запальвае вокны свае
не патрэбны нікому прытулак.

* * *

Пустыя вачніцы былых успамінаў
глядзяць падазрона на новы радок,
на бераг ракі наплываюць ільдзіны,
і вецер агучвае кожны твой крок;
агучвае звонам бляшанкі тужлівым,
пакетам з-пад чыпсаў, старым ліхтаром,
а ты прамінаеш ізноў баязліва
знаёмую вуліцу, браму і дом.
Так страшна застацца, так страшна спыніцца,
так страшна дзяжурныя фразы пачуць,
міргае ў трывожных руках запальніца,
як быццам са сцэны сігнал гледачу.
І толькі калоціцца сэрца няўмольна,
і стрэлаў чарга, быццам роспачны знак,
і розум нічога давесці няздольны
імкліваму сэрцу.
                    Няхай будзе так.

* * *

Я ў тую ноч стаяла ля вакна і вывучала
спалучэнні зорак.
І — як і ты — у той жа самы час —
шукала блаславёную дарогу
па промнях гарадскіх агнёў і — да Антарэс,
яе рубінавы пагляд мацней за вечнасць.
І мне здалося — лёгкасцю хады
напоўніць лепш за ўсё абрысы словаў:
ёсць дадзенае, простае, як неба,
яно не патрабуе тлумачэнняў;
ёсць дадзенае, простае, як мора
таго святла, што рассякае цемру,
каб зноў і зноў разгублены вандроўнік
знаходзіў блаславёную дарогу.

Фантазія бязмерная мая,
крыштальная наіўнасць спадзяванняў,
у вартасцях нязведаных маршрутаў
даводзіцца міжволі сумнявацца.
Але цяпер душы маёй застацца
у вакууме між зямлёй і небам?
Але цяпер душы маёй застацца?..

Вазьмі яе, рубінавая зорка.

* * *

столькі смутку і столькі любові
несла гэтая рака без берагоў
гэтая рака што страціла берагі
і пабегла ў шырокі свет
руйнуючы бліжэйшыя пабудовы
і драўляны карабель
зроблены вясковым хлапчуком
зачапіўся за хмызняк
і замарудзіў сваю хуткасць
здавалася
гэтая рака невычэрпная
але няма нічога невычэрпнага
акрамя спасціжэння ісціны
і маленькая дзяўчынка
якая назірала за рухам плыні
плакала ад бездапаможнасці
але рака сышла ў зямлю
і выраслі кветкі лотаці
і зашумела жыта
і ў яго зярнятах гучала
столькі смутку і столькі любові
што не дараваць было немагчыма

* * *

Свяшчэнных гімнаў гукі заціхаюць,
Вяртаецца здарожаны мастак,
І бляск натхнення вочы асвятляе —
Ён ведае цяпер і што, і як.

Ён ведае, як ранішняй парою
Гранаты адцаюць свой свежы сок,
Як выспявае дзень над галавою
І падае ў бурштынавы пясок.

Як прыцемкі ахопліваюць горад,
І паміж пальмаў ззяюць ліхтары,
Як нетаропка падымае мора
З глыбінь свае шматлікія дары.

Ён ведае, што можа здзейсніць колер,
Каб перадаць пачуцці і настрой,
І як мяняе воблік наваколле,
Калі ўзнікае светлы вобраз твой.

* * *

Яна ідзе, а музыка аргана
ляціць услед над плошчай зруйнаванай,
дзе між узгоркаў бітага асфальту
губляюць сілу ноты трапяткія.

На сценах літары палаюць залатыя,
і пыл у сонечным святле дрыжыць,
і, мне здаецца, працінае вітражы
дагэтуль незнаемы лёгкі вецер.

І непаўторнае шчымлівае імгненне,
дзе ёсць усё — і сум, і захапленне,
не згасне і не спыніцца,
пакуль
яна ідзе, а музыка аргана
ляціць услед.

І лашчыць ёй руку.

* * *

На маіх невераГодных станах
Засяроджаны і слых, і зрок,
І вясна ў выявах разнастайных
Загучала, быццам незнарок.
Прадчуванне першай навальніцы
Напаўняе водарам сусвет,
На сівых в і льготных камяніцах
Растае зімы апошні след.
Я вітаю сілу вольных хваляў,
Што да мора пабягуць наўпрост,
Развітальнай згадкаю паўсталі
Чырвань неба, пацалунак, мост,—
І становіцца пустой скарбонка,
А ў цішы раптоўна незямной
Праляціць старонка за старонкай,
Праплыве над сіняю вадой.
Адштурхнецца, дасягнуўшы мэты,
І ў бясхмарнасць вернецца сваю
Пачуццё, мне дадзенае светам,
Пачуццё, што свету аддаю.

* * *

І вось яна — жыцця майго палова —
га рою паўстае з-за далягляду.
Ўваходу не відно пакуль. Я крокі
наўмысна запавольваю, ды толькі
зямля здаецца мноствам вострых голак.

А на шляху да непазбежнай брамы
кладуцца лісцем дробныя правіны,
мінулых жарсцяў белае каменне,
і пачынаюць рухацца насустрач
краіны, гарады і кантыненты.

Каханы мой! У пошуках адзінства
і сэнсавызначальных накірункаў
я пакідаю верную сцяжыну
і рушу ў свет, дзе высахлы атрамант
захоўвае пульсацыю пачуццяў,
дзе злучаная з фонам папяровым
няўлоўнасць і быцця, і сузірання —
матыль, насаджаны на вастрыё мастацтва.

Скажы мне толькі: «Лёгкае дарогі».

**Адзін дзень**

Тым сумным днём ляцелі птушкі
у недасяжныя вышыні,
падманвала пяшчота сонца
адных, другіх — каханне гнала,
і траекторыя палётаў
сярод абшараў вечнай сіні
і непрычэсаных аблокаў
у плынях ветру раставала;
тым светлым днём гучалі крокі
па лесвіцах, што ўніз ліліся,
і над вадой у пацалунках
увасабляліся жаданні,
і ля Траецкага прадмесця
паміж сабой перапляліся
святло і цень, смугі карункі,
былых палацаў згадкі-здані;
тым дзіўным днём на клейкім лісці
дрыжалі дажджавыя сферы
і наваколле люстравалі
халоднай плацінай паверхні,
а паміж імі праплывалі
спадарыні і кавалеры,
і з годнай стрыманасцю ценяў
яны ішлі праз горад Верхні;
і я сама зачаравана
на іх павольны рух глядзела,
мой цень сваёй ядвабнай сукняй
між іншых строяў вызначаўся,
ад блізкасці часоў мінулых
паветра гулкае трымцела,
а колер воднае прасторы
з высокім небам спалучаўся.

© OCR: Камунікат.org, 2011 год
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2011 год
© PDF: Камунікат.org, 2011 год

## ЗМЕСТ

АВАЛОДВАННЕ

*І я пайшла...*
*Абяцанне высокага неба...*
*Сонца гарачайдалоняй...*
*Прадказанне*
*Спыніўся за зялёнай драпіроўкай...*
*Уздыхніз палёгкаю...*
*Пяшчотна-ружовым колерам...*
*Паўзе задуменна блакітная вадкасць...*
*Жыццё без фіранак...*
*Аднойчы — снег...*
*Святлафоры*
*Асцярожна, крок за срокам...*
*Ад дабра не шукаюць дабра...*
*Сонца раскідае промні ria каменнях...*
*І ты не адводзіш вачэй...*
*Узапыленымгорадзе...*
*Блакітныя шпалеры...*
*Вярніце мне маю душу..*
*імправізацыя на зададзеную тэму*
*Ці зведалі вы, якспыняецца сэрца...*
*Авалодванне*
*Мой нерэальны свет..*
*не будзе...*
*Зорыпадалі, згасалі...*
*Да споведзі страты..*
*Cortona*
*Жоўтая ноч...*
*Яны ідуць упэўненай хадою...*

І ЎЗЫДЗЕ ПРЫГАЖОСЦЬ...

*Трапяткі і пужлівы...*
*Бессмяротную восень*
*У пошуках блакітных сілуэтаў...*
*Заснуць ля гэтых камяніцаў...*
*Rocca Paolina*
*Па спіралі...*
*Тонкім пальцам водзячы па шкле...*

*Запрашальным, чароўным, лірычным...*
*Па-над прыцемак сумненнем...*
*Дубль I*
*Дубль 2*
*Дубль 3*
*Па сутнасці радасць... 50*
*Трыяда*
*Рыбінай на беразе пустэльным...*
*Год за годам, крок за крокам...*
*Грымотны дзень...*
*Аніякіх прадчуванняў...*
*кожны тыдзень — прыступка...*
*выплываюцьз віроў глыбокіх...*
*Ноч звініць над нашай хаткай...*
*Там за небакраем...*
*Так абачліва і далікатна...*
*Асветленая зоркаю Антарэс...*
*Над далінай вятрам наўздагон...*
*Гэта прыцемак вясновы...*
*Эміграцыя*
*І ўзыдзе прыгажосць...*
*Ні попелу духмяных цыгарэтаў...*
*Белы палац...*
*У галерэі маленькіх кавярняў...*
*З гэтых паштовак...*

СУМНАЯ МЕЛОДЫЯ 2002

*Зноў на лесвіцы п'яны нябога...*
*Круціцца б на лісце гарлачыку...*
*Праз шэраг непазбежных дат...*
*дождж не мае пачатку...*
*Вечар топіцца ўсамоце...*
*цішыня пустых квадратаў...*
*за кожным ліхтаром — Поўня...*
*Ён сочыць за тваімі рухамі...*
*я плыву на хвалях ветру...*
*Пакінуць некалькі радкоў...*
*сказаць няпроста і пайсці няпроста...*
*адчыняюцца вокны мансардаў...*
*Цацкі без цябе сумуюць...*

*Надыдзе час сказаць, дзеля чаго...*
*Твае гуманістычныя памкненні...*
*Спараджаюцца розуму сном...*
*чорным крыллем BMW...*
*Неадольным трымценнем напятае аркі...*
*Разглядаць людзей праз шкло кавярні...*

## ГРАНАТАВЫ СОК

*Хочацца зноў у расчыненай далечы...*
*Мой недавер з цынізмам на мяжы...*
*Сэрца...*
*У гэтым горадзе са спыненым дыханнем...*
*Ночы канец. Шараватым святлом...*
*Па вяршалінах спелай канюшыны...*
*Трывалы гук выгойдвае дарога...*
*4х8*
*Кроплі ўзыходзяць і робяцца хвалямі...*
*Гэта я цудоўная асадка...*
*Думка скіраваная ў прастору...*
*Вясёлы бог смарагдавых акацый...*
*І я маўчала...*
*Што значыць стацца самадастатковай?*
*Адчуваючы спінаю падлогу...*
*Рука расціскаецца...*
*сексуальнае паветра па-над горадам лунае...*
*мяне ўсе кінулі...*
*Калі мы вярталіся...*
*Неперайўзыдзены майстар...*
*Праз пластыкавыя вокны....*
*Я б хацела з табою прачнуцца...*
*Пустыя вачніцы былых успамінаў...*
*Я ў тую ноч стаяла ля вакна...*
*Столькі смутку і столькі любові...*
*Свяшчэнных гімнаў гукі заціхаюць...*
*Яна ідзе, а музыка аргана...*
*На маіх неверагодных станах...*
*І вось яна — жыцця майго палова...*
*Адзіндзень -*

Данільчык А.
*Il Mezzogiorno. Поўдзень: вершы / Аксана Данільчык. — Мінск: Кнігазбор, 2006. — 116 с.*

*ISBN 985-6824-39-7*

Адарыццё сябе праз адкрыццё свету, авалодванне майстэрствам мастацкага ўвасаблення жыцця ў слове, адчуванне незваротнасці часу і каштоўнасці кожнага імгнення, думка як вынік дзейнасці чалавека — тэма новай кнігі вершаў Аксаны Данільчык «IL MEZZOGIORNO / Поўдзень».

*УДК 821.161.3-1*
*ББК 84(4 Беи)*

*Літаратурна-мастацкае выданне*
*Данільчык Аксана Аляксееўна*
***IL MEZZOGIORNO***
*ПОЎДЗЕНЬ*
*Вершы*
*Адказны за выпуск Г. Вінярскі*
*Рэдактар М. Скобла*
*Карэктар Л. Камінская*
*Тэхнічны і мастацкі рэдактар А. Глекаў*
*Камп'ютэрная вёрстка А. Глекава*
*Падпісана да друку 28.11.2006 г.*
*Фармат 84х108 ¹/32. Папера афсетная. Гарнітура Literaturnaya.*
*Друк афсетны. Ум. друк. арк. 6,09. Ул.-выд. арк. 2,98.*
*Наклад 300 асобнікаў. Зак. № 1492.*
*ПУП «КНІГАЗБОР».*
*220112 г. Мінск, вул. Я. Лучыны, 38-93.*
*ЛИ № 02330/0131712 ад 12.05.2006 г.*
*Надрукавана з дыяпазітываў заказчыка*
*ў друкарні УП «Ходр» ОО «БелИЗ»*
*ЛП № 02330/0056661 ад 29.03.2004 г.*
*220004 г. Мінск, вул. Вызвалення, 9.*